# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сярэдняя школа №2 г. Смаргоні" (далей – Установа) з'яўляецца юрыдычнай асобай і ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Статутам і іншымі нарматыўнымі актамі Рэспублікі Беларусь.

2. Юрыдычны адрас Установы: 231045 вул. Леніна, 33, г. Смаргонь, Гродзенская вобласць. Поўная назва ўстановы на беларускай мове: дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сярэдняя школа №2 г. Смаргоні", на рускай мове: государственное учреждение образования "Средняя школа №2 г. Сморгони". Скарочаная назва на беларускай мове: Сярэдняя школа №2 г. Смаргоні, на рускай мове: Средняя школа №2 г. Сморгони.

2. Сярэдняя школа — установа агульнай сярэдняй адукацыі, якая функцыянуе ў складзе I—XI класаў, у якой ажыццяўляецца навучанне і выхаванне на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.
Агульная сярэдняя адукацыя ўключае тры ступені:
I ступень — пачатковая адукацыя (I — IV класы);
II ступень — базавая адукацыя (V — IX класы);
III ступень — сярэдняя адукацыя (X — XI класы)

3. Заснавальнікам Установы з'яўляецца Смаргонскі раённы выканаўчы камітэт.

4. Тып Установы можа быць зменены. Рашэнне аб змене тыпу Установы прымаецца заснавальнікам па ўласнай ініцыятыве або па ініцыятыве Установы пры абгрунтаванні неабходнасці змену тыпу Установы, адпаведнасці Установы крытэрыям заяўленага тыпу.

5. Рашэнне аб рэарганізацыі і ліквідацыі Установы прымаецца іх заснавальнікам.

6. Установа вядзе архіўную справу і справаводства ў парадку, вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь на беларускай і рускай мовах.

7. Адукацыю ва Установе атрымліваюць у вочнай форме атрымання адукацыі (адукацыя і выхаванне прадугледжваюць пастаянны асобасны ўдзел вучняў у рэгулярных занятках і атэстацыі).
На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма пачатковай адукацыі (тэрмін навучання – 4 гады);
На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма базавай адукацыі (тэрмін навучання – 5 гадоў);
Засваенне зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі з'яўляецца абавязковым.
На III ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма сярэдняй адукацыі (тэрмін навучання – 2 гады).
Тэрмін атрымання агульнай базавай адукацыі складае дзевяць гадоў, агульнай сярэдняй адукацыі складае адзінаццаць гадоў.

8. Установа праходзіць атэстацыю ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

9. Дзяржаўная акрэдытацыя Установы праводзіцца ў выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

10. Установа мае права ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і міжнароднымі пагадненнямі Рэспублікі Беларусь. Міжнароднае супрацоўніцтва ажыццяўляецца на прынцыпах незалежнасці, роўнасці, узаемнай павагі і не павінна наносіць шкоду суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, нацыянальнай бяспецы і інтарэсам асобы, грамадства і дзяржавы.

11. Установа мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і сваёй назвай, а таксама штамп з назвай Установы, разліковы і іншыя рахункі ва ўстановах банкаў.

12. Кантроль за дзейнасцю Установы ажыццяўляе аддзел адукацыі спорту і турызму Смаргонскага раеннага выканаўчага камітэта.

13. Установай могуць ствараецца філіялы і прадстаўніцтвы, што ажыццяўляюць сваю дзейнасць на падставе палажэнняў, якія зацвярджаюцца Установай.

## ГЛАВА 2
## ПРАДМЕТ, МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ДЗЕЙНАСЦІ УСТАНОВЫ

14. Прадметам дзейнасці Установы з’яўляецца  ажыццяўленне навучання і выхавання на адпаведных ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

15. Асноўнымі задачамі Установы з'яўляюцца:

забеспячэнне атрымання навучэнцамі агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі агульнай сярэдняй адукацыі;

фарміраванне ў навучэнцаў навуковага светапогляду, духоўнай перакананасці, культуры паводзін, эстэтычнага густу;

умацаванне і захаванне фізічнага і псіхічнага здароўя навучэнцаў, выхаванне беражлівых і адказных адносін да свайго здароўя і здароўя іншых грамадзян, фарміраванне гігіенічных навыкаў і здаровага ладу жыцця;

падрыхтоўка навучэнцаў да ўсвядомленага прафесіянальнага самавызначэння, працягу адукацыі, працоўнай і грамадскай дзейнасці, сямейнага жыцця.

16. Для дасягнення сваіх задач Установа ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе:

адукацыйны працэс на аснове вучэбных планаў і вучэбных праграм;

выхаванне навучэнцаў у адпаведнасці з праграмай выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь.

17. Установа, акрамя асноўных функцый, у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, можа ажыццяўляць:

падрыхтоўку дзяцей да навучання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

арганізацыю навучання і выхавання дома навучэнцаў, якія па медыцынскіх паказчыках часова або пастаянна не могуць наведваць вучэбныя і факультатыўныя заняткі ва Установе;

эксперыментальную і інавацыйную дзейнасць;

атэстацыю ў парадку экстэрнату асоб, якія самастойна атрымліваюць агульную базавую, агульную сярэднюю адукацыю.

18. Ва Установе забараняецца стварэнне і дзейнасць палітычных партый, іншых грамадскіх арганізацый (аб'яднанняў), якія маюць палітычныя мэты, а таксама ананімная або іншая супярэчная заканадаўству Рэспублікі Беларусь дзейнасць рэлігійных арганізацый. Установа ў пазаўрочны час можа ўзаемадзейнічаць з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Парадак, умовы, змест і формы гэтага ўзаемадзеяння вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

19. Абавязковае медыцынскае абслугоўванне навучэнцаў ва Установе забяспечваецца дзяржаўнымі арганізацыямі аховы здароўя.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ СТРУКТУРЫ І ШТАТНАГА РАСКЛАДУ УСТАНОВЫ

20. Для ажыццяўлення навучання і выхавання навучэнцаў, як правіла, аднаго ўзросту па адпаведных вучэбных планах і вучэбных праграмах навучэнцы ва Установе аб'ядноўваюцца ў класы. Напаўняльнасць класаў не павінна перавышаць у I — IV класах — 20 вучняў; у V — XI класах — 25 вучняў.

21. Ва Установе могуць стварацца класы інтэграванага (сумеснага) навучання і выхавання для сумеснага навучання асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і асоб, якія не маюць фізічных і (або) псіхічных парушэнняў. Напаўняльнасць класаў інтэграванага навучання і выхавання не павінна перавышаць 20 навучэнцаў, з іх:

не больш трох асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднароднага характару пры навучанні і выхаванні дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю ці дзяцей, якія не бачаць, не чуюць, дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухавага апарату;

не больш шасці асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з парушэннямі аднароднага характару або дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы ці псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні);

не больш чатырох асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з рознымі (не больш двух) парушэннямі развіцця.

22. Парадак стварэння і асаблівасці функцыянавання класаў, адзначаных у пункце 22 гэтага Статута, вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

23. Для аказання ўсебаковай дапамогі сям'і ў навучанні і выхаванні дзяцей, стварэння ўмоў для развіцця творчых здольнасцей дзяцей, іх удзелу ў пазакласнай і пазашкольнай дзейнасці ва Установе пры ажыццяўленні навучання і выхавання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі можа стварацца група падоўжанага дня. Парадак адкрыцця, камплектавання, арганізацыі дзейнасці групы падоўжанага дня Установы вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

24. Штатны расклад Установы распрацоўвае і зацвярджае кіраўнік Установы на падставе тыпавых штатаў і нарматываў колькасці работнікаў Установы адпаведных тыпаў, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 4
## АСАБЛІВАСЦІ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ УСТАНОВЫ

25. Навучанне і выхаванне ва Установе ажыццяўляюцца на беларускай і рускай мовах.
26. Права на выбар навучання і выхавання на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь забяспечваецца развіццем класаў з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання.
27. Ва Установе вывучэнне беларускай, рускай і адной з замежных моў з'яўляецца абавязковым, за выключэннем асоб з парушэннем слыху і асоб з цяжкімі парушэннямі маўлення.
28. Вывучэнне беларускай (рускай) і замежнай моў асобамі з парушэннем слыху і асобамі з цяжкімі парушэннямі маўлення, якія навучаюцца на рускай (беларускай) мове, арганізуецца па жаданні законных прадстаўнікоў вучняў.
29. Абавязковая для вывучэння ва Установе замежная мова вызначаецца яе заснавальнікам з улікам патрэб дзяржавы і магчымасцей Установы.
30. Парадак вывучэння беларускай і (або) рускай моў замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, вучнямі, якія часова знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.
31. Па жаданні законных прадстаўнікоў дзяцей дашкольнага ўзросту, у тым ліку дзяцей, якія не наведваюць дашкольныя ўстановы, ва Установе можа ажыццяўляцца падрыхтоўка іх дзяцей да навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.
32. Падрыхтоўка дзяцей дашкольнага ўзросту да навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца ва Установе на спецыяльна арганізаваных занятках з дзецьмі (далей — заняткі), а таксама праз аказанне законным прадстаўнікам дзяцей кансультацыйнай дапамогі (далей — кансультацыі).
33. Правядзенне заняткаў, кансультацый накіравана на забеспячэнне сацыялізацыі дзяцей у калектыве аднагодкаў і дарослых, фарміраванне асноў гатоўнасці да навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.
34. Заняткі і кансультацыі праводзяцца ў адпаведнасці з вучэбным планам і па вучэбнай праграме, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.
35. Для правядзення заняткаў фарміруюцца групы, напаўняльнасць якіх складае не больш за 20 дзяцей.
36. Заняткі і кансультацыі праводзяцца ў час канікул, у тым ліку і летніх канікул.

37. Тэрміны і працягласць іх правядзення, колькасць груп вызначаюцца Установай.
38. Расклад заняткаў, правядзення кансультацый зацвярджаецца кіраўніком Установы і даводзіцца да ведама законных прадстаўнікоў дзяцей.
39. Заняткі, кансультацыі праводзяць педагагічныя работнікі Установы ў межах іх працоўнага часу з улікам устаноўленага аб'ёму педагагічнай работы.
40. Па рашэнні заснавальніка ва Установе можа ажыццяўляцца прафесіянальная падрыхтоўка навучэнцаў X—XI класаў на базе:
школьных і міжшкольных вучэбна-вытворчых майстэрняў;
школьнага і міжшкольнага вучэбна-вытворчых камбінатаў працоўнага навучання і прафесіянальнай арыентацыі навучэнцаў;
устаноў адукацыі, якія забяспечваюць атрыманне прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі.
41. Кіраўнік сярэдняй школы не мае права адмовіць у залічэнні ў X клас асобам, якія атрымалі агульную базавую адукацыю ў гэтай установе.
42. Установай праводзіцца атэстацыя навучэнцаў у парадку экстэрнату.
43. Рашэнне аб допуску да атэстацыі ў парадку экстэрнату прымаецца аддзелам адукацыі, спорту і турызму мясцовага выканаўчага органа па месцы жыхарства асобы на падставе яго заявы (заявы законнага прадстаўніка непаўналетняга).
44. Парадак атэстацыі ў парадку экстэрнату вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 5
## ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА І ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСАЎ

45. Арганізацыя адукацыйнага працэсу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі, якія распрацоўваюцца і зацвярджаюцца Установай з улікам канкрэтных умоў на аснове тыпавога вучэбнага плана.
46. У структуры вучэбнага плана на бягучы навучальны год выдзяляюцца дзяржаўны кампанент і факультатыўныя заняткі.
47. Дзяржаўны кампанент вучэбнага плана забяспечвае адзіныя патрабаванні да аб'ёму вучэбнай нагрузкі пры вывучэнні вучэбных прадметаў на базавым узроўні, устанаўлівае абавязковую тыднёвую колькасць гадзін па класах на аднаго навучэнца пры вывучэнні ўсіх вучэбных прадметаў на базавым узроўні, максімальную вучэбную нагрузку на аднаго навучэнца.

47.1 . Факультатыўныя заняткі вучэбнага плана забяспечваюць стварэнне ўмоў для арганізацыі навучання з улікам індывідуальных патрэб, здольнасцей і запытаў навучэнцаў, тыпу і магчымасцей Установы.

47.2 . Вучэбныя дасягненні навучэнцаў на факультатыўных занятках ацэньваюцца славесна, на змястоўна-ацэначнай аснове без выстаўлення адзнак.

47.3 Факультатыўныя заняткі не з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх

навучэнцаў.

47.4 Пры правядзенні заняткаў з ліку гадзін, адведзеных на факультатыўныя заняткі, неабходна прадугледжваць максімальна дапушчальную вучэбную нагрузку на аднаго навучэнца. Гадзіны, адведзеныя на факультатыўныя заняткі, тыпавога вучэбнага плана на бягучы навучальны год забяспечваюць асобасную арыентацыю адукацыйнага працэсу з улікам умоў і магчымасцей Установы. Гадзіны, адведзеныя на факультатыўныя заняткі, на бягучы навучальны год выкарыстоўваюцца для правядзення:

стымулюючых, падтрымліваючых заняткаў у I—XI класах;

факультатываў у I-XI класах;

для дзялення класа на групы пры вывучэнні замежнай мовы, працоўнага навучання, інфарматыкі, дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўкі.

48 Навучэнцы з улікам меркавання іх законных прадстаўнікоў зыходзячы са здольнасцей, пажаданняў і стану здароўя могуць вывучаць асобныя прадметы на павышаным узроўні на факультатыўных занятках у межах колькасці вучэбных гадзін на правядзенне факультатыўных заняткаў, устаноўленай тыпавым вучэбным планам.

49 Гадзіны, адведзеныя на факультатыўныя заняткі, вучэбнага плана на бягучы навучальны год размяркоўваюцца педагагічным саветам Установы, зыходзячы з розніцы паміж агульнай колькасцю вучэбных гадзін, якія фінансуюцца з бюджэту, і колькасцю вучэбных гадзін дзяржаўнага кампанента вучэбнага плана на бягучы навучальны год.

50 Вучэбныя праграмы зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

51 Вучэбныя планы Установы на бягучы навучальны год, вучэбныя праграмы па ўсіх вучэбных прадметах дзяржаўнага кампанента распрацоўваюцца на падставе адукацыйных стандартаў агульнай сярэдняй адукацыі.

## ГЛАВА 6
## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

52 Адукацыйны працэс ва Установе павінен забяспечыць ахову здароўя навучэнцаў, падтрыманне іх працаздольнасці на працягу вучэбнага дня, вучэбнага тыдня, навучальнага года, неабходную рухальную актыўнасць, развіццё індывідуальных здольнасцей па інтарэсах.

53 Для арганізацыі адукацыйнага працэсу Установа:

53.1 вызначае структуру навучальнага года па чвэрцях або паўгоддзях з улікам патрабаванняў санітарных нормаў, правілаў, гігіенічных нарматываў;

53.2 распрацоўвае вучэбныя планы на бягучы навучальны год на падставе тыпавых вучэбных планаў на бягучы навучальны год і тлумачальнай запіскі па арганізацыі адукацыйнага працэсу;

53.3 выкарыстоўвае вучэбныя праграмы, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

54 Вучэбныя планы зацвярджаюцца кіраўніком Установы па ўзгадненні з аддзелам адукацыі спорту і турызму Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта.

55 Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі з’яўляецца вучэбны занятак.

56 Штодзённая колькасць вучэбных заняткаў ва Установе і іх паслядоўнасць вызначаюцца раскладам, які складаецца з улікам патрабаванняў санітарных правілаў, нормаў, гігіенічных нарматываў. Расклад вучэбных заняткаў зацвярджаецца кіраўніком Установы.

57 Абавязковыя заняткі па асновах бяспекі жыццядзейнасці, вучэбна-палявыя зборы, а таксама стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі, факультатыўныя заняткі, праводзяцца ў адпаведнасці з раскладамі, якія зацвярджаюцца кіраўніком Установы.

58 Вучэбныя заняткі ва Установе праводзяцца ў дзве змены.

Працягласць перапынкаў паміж урокамі вызначаецца, зыходзячы з канкрэтных умоў працы Установы, неабходнасці забеспячэння арганізацыі харчавання навучэнцаў і іх адпачынку ў адпаведнасці з патрабаваннямі санітарных правілаў, нормаў, гігіенічных нарматываў.

59 Адукацыйны працэс пры навучанні і выхаванні на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца ў рэжыме шасцідзеннага школьнага тыдня, які ўключае пяцідзенны вучэбны тыдзень і адзін дзень тыдня для правядзення з навучэнцамі спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых, іншых выхаваўчых мерапрыемстваў, арганізацыі працоўнага навучання, у тым ліку факультатыўных заняткаў дляназвучэнцаў III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

60 Патрабаванні да фарміравання вуснай і пісьмовай мовы навучэнцаў Установы, да правядзення, праверкі і ацэньвання навучальных і кантрольных работ, якія праводзяцца ў пісьмовай форме, прыкладную колькасць і аб'ём кантрольных работ, парадак вядзення і афармлення сшыткаў, рэфератаў, дзённікаў і класных журналаў вызначаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

61 Вынікі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах, паводзіны навучэнцаў Установы ацэньваюцца пры правядзенні іх атэстацыі.

62 Парадак і формы правядзення атэстацыі навучэнцаў Установы, пераводу іх у наступны клас, прагляду станоўчай гадавой адзнакі, вызвалення ад выпускных экзаменаў, допуску да выпускных экзаменаў, арганізацыі выпускных экзаменаў і выпуску вучняў Установы вызначаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

63 Пералік захворванняў, якія з'яўляюцца падставай для вызвалення навучэнцаў Установы ад выпускных экзаменаў за перыяд навучання на ўзроўнях II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 7
## АСАБЛІВАСЦІ ПЕРАВОДУ Ў НАСТУПНЫ КЛАС АСОБНЫХ ВУЧНЯЎ

64 Рашэнне аб пераводзе навучэнцаў у наступны клас прымаецца педагагічным саветам Установы, зацвярджаецца загадам кіраўніка Установы і даводзіцца да ведама навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў.

65 У класным журнале і іншай дакументацыі Установы робяцца адпаведныя запісы аб пераводзе навучэнцаў у наступны клас.

## ГЛАВА 8
## ПАЗАКЛАСНАЯ І ПАЗАШКОЛЬНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ВА УСТАНОВЕ

66 Асноўнай формай арганізацыі пазакласнай і пазашкольнай дзейнасці ва Установе з'яўляюцца заняткі ў аб'яднаннях па інтарэсах.

Аб'яднанне па інтарэсах — аб'яднанне навучэнцаў аднаго або рознага ўзросту на падставе агульнага інтарэсу да канкрэтнага кірунку дзейнасці.

67 Да аб'яднанняў па інтарэсах адносяцца гурток, клуб, секцыя, студыя, майстэрня, лабараторыя, тэатр, навуковае таварыства і іншыя аб'яднанні па інтарэсах.

68 Аб'яднанні па інтарэсах ствараюцца ў адпаведнасці з інтарэсамі навучэнцаў, пажаданнямі іх законных прадстаўнікоў, а таксама з улікам магчымасцей Установы.

69 Змест дзейнасці аб'яднання па інтарэсах вызначаецца педагогам дадатковай адукацыі, які прадугледжаны статутам Установы, з улікам навучальна-выхаваўчых праграм.

70 Заняткі ў аб'яднаннях па інтарэсах вядуцца па навучальна-выхаваўчых праграмах, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. У асобных выпадках ва Установе па некаторых профілях дзейнасці аб'яднанняў па інтарэсах праграмы могуць быць складзены іх кіраўнікамі, творчымі, навуковымі, педагагічнымі работнікамі; такія праграмы ўзгадняюцца педагагічным саветам і зацвярджаюцца кіраўніком Установы.

71 Напаўняльнасць аб'яднанняў па інтарэсах – не менш, чым 15 чалавек, асаблівасці іх работы такія ж, як і пры арганізацыі дзейнасці аб'яднанняў па інтарэсах ва ўстановах, якія забяспечваюць дадатковую адукацыю.

72 Аб'яднанні па інтарэсах фарміруюцца на падставе заяў навучэнцаў (іх законных прадстаўнікоў) на імя кіраўніка Установы, а таксама з улікам здароўя вучняў.

73 Дзейнасць аб'яднанняў па інтарэсах ажыццяўляецца па раскладзе, які зацвярджаецца кіраўніком Установы.

74 Установа ў працэсе ажыццяўлення выхаваўчай дзейнасці можа праводзіць конкурсы, фестывалі, форумы, алімпіяды, спаборніцтвы, злёты, канферэнцыі, выставы, экспедыцыі, паходы і іншыя мерапрыемствы.

# ГЛАВА 9
# АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПРЫЁМУ, ПЕРАВОДУ І АДЛІЧЭННІ ВУЧНЯЎ УСТАНОВЫ. ДЫСЦЫПЛІНАРНАЯ АДКАЗНАСЦЬ ШКОЛЬНІКАЎ

75 Прыем навучэнцаў ва Установу для атрымання адукацыі ажыццяўляецца згодна з кантрольнымі лічбамі прыему, з улікам патрабаванняў санітарных нормаў, правілаў і гігіенічных нарматываў. Кантрольныя лічбы прыёму для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі дзяцей ўстанаўліваюцца штогод заснавальнікам Установы.

76 Прыём дзяцей ва Установу ажыццяўляецца без уступных іспытаў.

77 У першы клас прымаюцца асобы, якім на 1 верасня адпаведнага навучальнага года споўнілася шэсць і больш год. Па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў дзіцяці дапускаецца прыем у першы клас асобы, якой шэсць год споўніцца ў перыяд з 1 па 30 верасня адпаведнага навучальнага года.

78 Для прыёму дзяцей у І клас ва Установу законныя прадстаўнікі ў перыяд з 1 чэрвеня па 28 жніўня падаюць заяву на імя кіраўніка Установы і прадстаўляюць наступныя дакументы: копію пасведчання аб нараджэнні дзіцяці; даведку аб стане здароўя дзіцяці.

79 У І клас Установы прымаюцца ў першую чаргу дзеці, якія пражываюць на тэрыторыі мікрараёна, замацаванага за Установай рашэннем Смаргонскага раённага выканаўчыга камітэта. Дзеці, якія не пражываюць на тэрыторыі мікрараёна, які замацаваны за Установай, могуць быць залічаны ва Установу пры наяўнасці ў ей свабодных месцаў. Залічэнне на свабодныя вучнёўскія месцы Установы ажыццяўляюць у парадку чарговасці падачы заявы законнымі прадстаўнікамі навучэнцаў.

80 Рашэнне аб залічэнні дзяцей ва Установу для навучання ў І класе афармляецца загадам кіраўніка Установы не пазней за 31 жніўня і даводзіцца да іх законных прадстаўнікоў.

81 Прыём у парадку пераводу навучэнца з іншай Установы для навучання ў адпаведным класе на І і ІІ ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, ажыццяўляецца на падставе заявы яго законных прадстаўнікоў.

Установа, дзе навучалася асоба, не павінна перашкаджаць пераводу навучэнца ў іншую Установу.

82 Для залічэння ва Установу навучэнцаў ў парадку пераводу законныя прадстаўнікі разам з заявай на імя кіраўніка Установы прадстаўляюць наступныя дакументы: асабовую картку; даведку аб стане здароўя дзіцяці.

83 Рашэнне аб залічэнні навучэнца ва Установу ў парадку пераводу для навучання ў адпаведным класе афармляецца загадам кіраўніка Установы не пазней чым за тры дні з дня падачы заявы і даводзіцца да законных прадстаўнікоў навучэнца.

84 Прыём асоб ва Установу для навучання ў адпаведным класе на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на падставе заявы на імя кіраўніка Установы і наступных дакументаў: пасведчання аб агульнай базавай адукацыі; даведкі аб стане здароўя дзіцяці.

85 Рашэнне аб залічэнні асоб ва Установу для навучання ў адпаведным класе на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі афармляецца загадам кіраўніка Установы не пазней за 31 жніўня.

86 Перавод навучэнцаў у іншыя ўстановы ў выпадку рэарганізацыі, ліквідацыі або адмовы ў дзяржаўнай акрэдытацыі Установы забяспечваецца заснавальнікам са згоды законных прадстаўнікоў навучэнцаў і па ўзгадненні з установамі, у якія пераводзяцца .

87 Навучэнцы адлічваюцца з Установы:

у сувязі з завяршэннем навучання ва Установе;

у сувязі з пераводам у іншыя агульнаадукацыйныя ўстановы або ва ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

па асабістым жаданні ў сувязі з пераходам на самастойную форму атрымання адукацыі.

88 Навучэнцы Установы могуць быць прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці. Падставай для прыцягнення вучня да дысцыплінарнай адказнасці з'яўляюцца:

89.1. супрацьпраўнае, віноўнае (наўмыснае або па неасцярожнасці) невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў, ускладзеных на яго актамі заканадаўства і іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі Установы ў выглядзе:

89.2. спазненне або неяўкі без уважлівых прычын на вучэбныя заняткі,

парушэння дысцыпліны ў ходзе адукацыйнага працэсу, знявагі ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу;

89.3. невыканання без уважлівых прычын законнага патрабавання педагагічнага работніка;

89.4. псавання памяшканняў, абсталявання, мэблі і іншай маемасці Установы, невыканання (парушэння) патрабаванняў заканадаўства аб ахове здароўя, пажарнай бяспекі;

89.5. распіцця алкагольных напояў, слабаалкагольных напояў, піва, ужывання наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных і іншых рэчаў або з'яўлення ў вызначаных месцах у стане алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення;

89.6. курэння (спажывання) тытуневых вырабаў на тэрыторыі Установы;

89.7. распаўсюджвання інфармацыі, якая можа нанесці шкоду здароўю вучняў і іншых супрацьпраўных дзеянняў.

89 Да дысцыплінарнай адказнасці прыцягваецца навучэнец, які дасягнуў на момант здзяйснення дысцыплінарнага праступка ўзросту чатырнаццаці гадоў, а навучэнец з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця – сямнаццаці гадоў.

90 За здзяйсненне дысцыплінарнага праступка да навучэнца могуць прымяняцца наступныя меры дысцыплінарнага спагнання: заўвага, выгавар, адлічэнне.

91 Адлічэнне як мера дысцыплінарнай адказнасці можа прымяняцца за:

91.1 працяглую адсутнасць (больш трыццаці дзен) без уважлівых прычын на вучэбных занятках на працягу навучальнага года;

91.2 сістэматычнае (паўторнае на працягу навучальнага года) невыкананне ці неналежнае выкананне абавязкаў навучэнцаў, калі да яго раней прымяняліся меры дысцыплінарнага спагнання.

92 Адлічэнне як мера дысцыплінарнага спагнання не прымяняецца да:

92.1 навучэнца, які не закончыў засваенне зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, які не прйшоў выніковую атэстацыю за перыяд атрымання агульнай базавай адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі;

92.2 навучэнца, які не дасягнуў узросту шаснаццаці год;

93 Права выбару меры дысцыплінарнага спагнання належыць кіраўніку Установы. Пры выбары меры дысцыплінарнага спагнання ўлічваюцца цяжар дысцыплінарнага праступка, прычыны і абставіны, пры якіх ен здзейснены, папярэднія паводзіны навучэнцаў.

94 Рашэнне аб адлічэнні навучэнцаў з Установы прымаецца педагагічным саветам Установы.

95 Адлічэнне навучэнцаў з Установы афармляецца загадам яе кіраўніка з указаннем падставы і даводзіцца да законных прадстаўнікоў навучэнцаў, аддзела адукацыі, спорту і турызму Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта.

## ГЛАВА 10
## КАМПЕТЭНЦЫЯ УСТАНОВЫ

96 Установа самастойная ў вырашэнні пытанняў арганізацыі адукацыйнага працэсу, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні адукацыі, ажыццяўленні фінансава-гаспадарчай і іншай дзейнасці ў межах, вызначаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

97 Установа ажыццяўляе наступны ліцэнзіраваны від дзейнасці: ахоўная дзейнасць; іншая дзейнасць якая ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца пры атрыманні адпаведнага спецыяльнага дазволу (ліцэнзія).

98 Установа займаецца наступнымі відамі эканамічнай дзейнасці:

| Код | Назва адпаведна з даведнікам відаў эканамічнай дзейнасці |
|---|---|
| 80102 | Агульная пачатковая адукацыя (першая ступень агульнай сярэдняй адукацыі) |
| 80210 | Агульная сярэдняя адукацыя |
| 80424 | Іншая адукацыя для дарослых і іншая адукацыя, не ўключаная ў іншыя групіроўкі |

92512 Дзейнасць бібліятэк

92513 Дзейнасць архіваў

99 Да кампетэнцыі Установы адносяцца:

99.1 падбор, прыём і расстаноўка кадраў, павышэнне ўзроўню іх кваліфікацыі;

99.2 ажыццяўленне кантролю за выкананнем педагагічнымі работнікамі і навучэнцамі (выхаванцамі) сваіх абавязкаў;

99.3 матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з дзяржаўнымі нарматывамі;

99.4 прыцягненне для ажыццяўлення дзейнасці, якая прадугледжана статутам Установы, дадатковых фінансавых і матэрыяльных сродкаў у парадку, які ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

99.5 арганізацыя і ўдасканаленне метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу;

99.6 удзел у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці;

99.7 распрацоўка і зацвярджэнне вучэбных планаў на бягучы навучальны год на падставе адпаведных тыпавых вучэбных планаў на бягучы навучальны год і тлумачальнай запіскі па арганізацыі адукацыйнага працэсу;

99.8 ажыццяўленне бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыі вучняў Установы, а таксама аналізу вынікаў адукацыйнага працэсу;

99.9 ажыццяўленне іншай дзейнасці, якая не забаронена заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і прадугледжана статутам Установы.

100 Установа абавязана:

100.1 ажыццяўляць сваю дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

100.2 забяспечваць якасць адукацыі, ажыццяўляючы адукацыйны працэс у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйных стандартаў агульнай сярэдняй адукацыі і распрацаваных на іх падставе тыпавых вучэбных планаў на бягучы навучальны год, тлумачальнай запіскі па арганізацыі адукацыйнага працэсу, вучэбных праграм;

100.3 забяспечваць распрацоўку і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння, яго ўдасканаленне; распрацоўку і прыняцце Правілаў унутранага распарадку Установы;

100.4 садзейнічаць стварэнню неабходных умоў для харчавання і медыцынскай дапамогі навучэнцам;

100.5 ажыццяўляць маральнае і матэрыяльнае стымуліраванне навучэнцаў, педагагічных і іншых работнікаў Установы;

100.6 забяспечыць патранат асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на працягу двух гадоў пасля атрымання ва Установе адукацыі згодна з Палажэннем аб патранаце асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, зацверджаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, меры сацыяльнай абароны вучняў;

100.7 прымаць удзел у фарміраванні кантрольных лічбаў прыему;

100.8 знаеміць асоб (законных прадстаўнікоў непаўналетніх) пры залічэнні ва Установу са Статутам, Правіламі ўнутранага распарадку Установы, а па іх патрабаванні і з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

100.9 садзейнічаць з дзяржаўнымі органамі ў правядзенні кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі.

101 Установа стварае неабходныя ўмовы для арганізацыі харчавання навучэнцаў.

101.1 Харчаванне арганізуецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі санітарных нормаў, правілаў і гігіенічных нарматываў па ўстаноўленых нормах харчавання і грашовых нормах расходаў на харчаванне для адпаведных катэгорый навучэнцаў. Пры неабходнасці арганізуецца дыетычнае харчаванне. Нормы харчавання, грашовыя нормы расходаў на харчаванне зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

101.2 Навучэнцы забяспечваюцца харчаваннем за кошт сродкаў законных прадстаўнікоў непаўналетніх, сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовага бюджэту, іншых крыніц у адпаведнасці з заканадаўствам.

101.3 Палажэнне аб арганізацыі харчавання навучэнцаў, забеспячэнні харчаваннем навучэнцаў за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовага бюджэту, памер і парадак аплаты за харчаванне зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

102 Карыстанне падручнікамі ва Установе можа быць платным і бясплатным.

103 Навучэнцы на час атрымання адукацыі за аплату забяспечваюцца Установай падручнікамі. Памер такой аплаты ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

104 Бясплатнае карыстанне падручнікамі ўстанаўліваецца для:

навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў;

дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, інвалідаў з дзяцінства;

навучэнцаў з сем'яў, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам атрымліваюць дзяржаўную дапамогу на дзяцей, старэйшых за тры гады;

навучэнцаў з сем'яў, у якіх бацькі з'яўляюцца інвалідамі І ці ІІ групы

105 Для навучэнцаў з мнагадзетных сем'яў плата за карыстанне падручнікамі зніжаецца на 50% ад устаноўленай платы за карыстанне адпаведнымі падручнікамі.

106 Установа нясе ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь адказнасць за:

невыкананне функцый, аднесеных да яе кампетэнцыі;

неадпаведнасць якасці адукацыі ўстаноўленым
патрабаванням;

дзеянні, якія выклікалі парушэнні нормаў па ахове здароўя і бяспекі жыцця навучэнцаў і работнікаў Установы, нормаў і правілаў аховы навакольнага асяроддзя ў час адукацыйнага працэсу;

незахаванне патрабаванняў санітарных нормаў, правілаў, гігіенічных нарматываў

парушэнне правоў і свабод навучэнцаў і работнікаў Установы.

## ГЛАВА 11
## ПАРАДАК КІРАВАННЯ УСТАНОВАЙ. УЗАЕМААДНОСІНЫ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

108. Кіраванне Установай ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, палажэннем аб адпаведным тыпе Установы, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, дадзеным Статутам, будуецца на прынцыпах адзінаначалля і самакіравання. Непасрэднае кіраванне Установай ажыццяўляе кіраўнік, які прызначаецца і вызваляецца з займаемай пасады ў парадку, устаноўленым Кодэксам аб адукацыі і іншымі заканадаўчымі актамі, аддзелам адукацыі спорту і турызму па ўзгадненні з Смаргонскім раенным выканаўчым камітэтам.

109. Калегіяльным органам Установы з'яўляецца педагагічны савет, дзейнасць якога ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пратаколы пасяджэння педагагічнага савета афармляюцца на асобных лістах і падпісваюцца старшыней і сакратаром.

110 Кіраўнік Установы ў дзейнасці па кіраванню Установай узаемадзейнічае з органамі самакіравання Установы.

Да органаў самакіраванняУстановы адносяцца:

Савет Установы;

Бацькоўскі камітэт Установы;

Папячыцельскі савет Установы.

111. Асноўным органам самакіравання з’яўляецца Савет Установы, які ўзначальвае кіраўнік Установы. Кампетэнцыя, склад і арганізацыя дзейнасці Савета Установы вызначаюцца Палажэннем аб Савеце Установы, зацверджаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

111.1 Савет ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, устаноўленым Палажэннем, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Статутам Установы адукацыі.

111.2 Колькасны склад савета фарміруецца у наступнай прапорцыі: 25% - прадстаўнікі навучэнцаў Установы адукацыі, іх законных прадстаўнікоў; 75% - прадстаўнікі кіраўнікоў структурных падраздзяленняў Установы адукацыі, педагагічных і іншых работнікаў Установы адукацыі, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых дзяржаўных органаў, арганізацый – заказчыкаў кадраў, грамадскіх аб’яднанняў, іншых арганізацый.

111.3 Прадстаўнікі навучэнцаў, іх законныя прадстаўнікі выбіраюцца адкрытым або тайным галасаваннем на класных, бацькоўскіх сходах, у парадку, устаноўленым Статутам Установы. Прадстаўнікі кіраўнікі структурных падраздзяленняў, педагагічных і іншых работнікаў Установы адукацыі выбіраюцца адкрытым або тайным галасаваннем у структурных падраздзяленнях. Прадстаўнікі мясцовых выканаўчых і распарадкавых органаў, іншых дзяржаўных органаў, арганізацый – заказчыкаў кадраў, грамадскіх аб’яднанняў, іншых арганізацый уключаюцца у склад савета на падставе прапаноў кіраўнікоў названых органаў і арганізацый.

111.4 Персанальны склад Савета зацвярджаецца загадам кіраўніка Установы.

111.5 Тэрмін паўнамоцтва Савета складае не больш пяці гадоў.

111.6 Дзейнасць Савета ажыццяўляецца ў адпаведнасці з планам работы, які складаецца на навучальны год і зацвярджаецца кіраўніком пасля разгляду на пасяджэнні Савета. Змест плана работы вызначаецца актуальнымі задачамі, якія стаяць перад Установай.

111.7 На пасяджэннях Савета вядзецца пратакол, у якім фіксуецца ход абмеркавання пытанняў, якія ўнесены ў павестку дня, а таксама вынікі галасавання і прынятае рашэнне. Кожны пратакол падпісваецца старшыней і сакратаром савета.

111.8 Рашэнні Савета, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і зацверджаныя кіраўніком Установы адукацыі з’яўляюцца абавязковымі для педагагічных і іншых работнікаў Установы, навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў.

112 Парадак стварэння і дзейнасць Бацькоўскага камітэта Установы, Папячыцельскага савета Установы ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

113 Кіраўнік Установы:

113.1 дзейнічае ад імя Установы без даверанасці і нясе адказнасць за вынікі яе дзейнасці;

113.2 выдае загады, заключае дагаворы, выдае даверанасці, адкрывае рахункі ў банках ў межах сваей кампетэнцыі;

113.3 нясе адказнасць за арганізацыю санітарна-гігіенічнага і проціэпідэмічнага рэжыму ва Установе, змест і арганізацыю адукацыйнага працэсу, харчаванне вучняў (выхаванцаў), аказанне медыцынскай дапамогі навучэнцам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

113.4 ажыццяўляе прыём на работу педагагічных і іншых работнікаў у агульнаадукацыйную ўстанову і іх звальненне, зацвярджэнне пасадавых інструкцый у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

114. Працоўныя адносіны работнікаў ва Установе рэгулююцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.
Кваліфікацыйныя патрабаванні да педагагічных і іншых работнікаў вызначаюцца кваліфікацыйнымі характарыстыкамі, зацверджанымі ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку.

115. Навучэнцамі Установы з’яўляюцца асобы, залічаныя ва Установу, згодна ўстаноўленага парадку для навучання і выхавання.

116. Навучэнцы Установы маюць права на:

- атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі агульнай сярэдняй адукацыі;
- атрыманне бясплатнай агульнай пачатковай, агульнай базавай, агульнай сярэдняй адукацыі за кошт сродкаў мясцовага бюджэту у парадку, прадугледжным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- атрыманне дадатковых адукацыйных паслуг у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

- выбар установы адукацыі;
- забеспячэнне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі ў парадку, устаноўленым Урадам Рэспублікі Беларусь

бясплатнае карыстанне інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэчна – інфармацыйнага цэнтра, вучэбнай, вытворчай, навуковай і культурна-спартыўнай базай Установы;

удзел ва ўпраўленні Установай праз органы самакіравання;

своечасовае атрыманне інфармацыі аб ацэнцы вынікаў асабістай дзейнасці, тэрмінах правядзення атэстацыі;

ахову свайго жыцця і здароўя ў ходзе адукацыйнага працэсу;

заахвочванне за поспехі ў вучэбнай, спартыўна-масавай, грамадскай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай дзейнасці, а таксама ў адукацыйных мерапрыемствах;

удзел у маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб’яднаннях, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь;

атрыманне харчавання ва Установе ў парадку і на ўмовах, вызначаных Урадам Рэспублікі Беларусь;

наведванне мерапрыемстваў, якія арганізуюцца Установай для навучэнцаў, з улікам узросту навучэнца;

абарону сваіх правоў, гонару і годнасці ў працэсе атрымання адукацыі.

117.Навучэнцы Установы абавязаны:

добрасумленна і адказна адносіцца да засваення зместу адукацыйных праграм, праграм выхавання;

клапаціцца аб сваім здароўі, не дапускаць прычынення шкоды здароўю другіх асоб;

імкнуцца да маральнага, духоўнага і фізічнага развіцця і самаўдасканалення;

з павагай адносіцца да нацыянальнай гісторыі, культуры свайго і другіх народаў;

быць дысцыплінаванымі, клапаціцца аб рэпутацыі Установы;

з годнасцю паводзіць сябе ва Установе і за яе межамі;

ахоўваць прыроднае асяроддзе;

беражліва адносіцца да маемасці Установы;

паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

выконваць патрабаванні педагагічных і другіх работнікаў Установы ў вобласці, аднесенай Статутам і Правіламі ўнутранага распарадку Установы да яе кампетэнцыі;

падпарадкоўвацца рашэнням органаў упраўлення і самаўпраўлення Установы, прынятым у межах яе кампетэнцыі, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь;

іншыя правы і абавязкі вучняў вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і гэтым Статутам;

за парушэнне Статута і Правіл унутранага распарадку Установы навучэнцам могуць быць аб’яўлены заўвагі або вымовы ў парадку, устаноўленым Статутам.

118. Педагагічнымі работнікамі Установы з’яўляюцца:

кіраўнік Установы, яго наменікі, спецыялісты, якія ажыццяўляюць ва Установе навучанне і выхаванне.

119. Кваліфікацыйныя патрабаванні да педагагічных работнікаў вызначаюцца кваліфікацыйнымі характарыстыкамі, зацверджанымі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

120. Педагагічныя работнікі Установы маюць права на:

забеспячэнне ўмоў для ажыццяўлення сваёй прафесійнай дзейнасці;

абарону прафесійнага гонару, годнасці пры выкананні службовых абавязкаў;

творчую ініцыятыву, выбар метадаў і форм навучання і выхавання, падручнікаў і дапаможнікаў, сродкаў навучання, якія забяспечваюць неабходную якасць адукацыйнага працэсу;

доступ да вучэбна-праграмнай, вучэбна-метадычнай дакументацыі, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў;

удзел ў абнаўленні, распрацоўцы і вызначэнні структуры і зместу структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі;

удзел у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай, міжнароднай дзейнасці Установы;

удзел у конкурсах прафесійнага майстэрства;

удзел у кіраванні Установай праз педагагічны савет, органы самакіравання Установы;

павышэнне кваліфікацыі;

маральнае і матэрыяльнае заахвочванне за поспехі ў педагагічнай дзейнасці;

аб'яднанне ў прафесійныя саюзы, іныя грамадскія аб'яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

штомесячную кампенсацыю расходаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры ў парадку і на ўмовах, згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

121. Педагагічныя работнікі Установы абавязаны:

ажыццяўляць сваю дзейнасць на высокім прафесійным узроўні, які забяспечвае атрыманне навучэнцамі адукацыі згодна з адукацыйнымі стандартамі агульнай сярэдняй адукацыі;

захоўваць прававыя, маральныя і этычныя нормы;

паважаць гонар навучэнцаў, іх законных прадстаўнікоў і іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

павышаць свой прафесійны ўзровень, праходзіць атэстацыю;

весці здаровы лад жыцця і прапагандаваць яго сярод навучэнцаў;

захоўваць спецыяльныя ўмовы, неабходныя для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

садзейнічаць выяўленню і развіццю індывідуальных творчых здольнасцей навучэнцаў;

ажыццяўляць прафілактычную работу па папярэджванні правапарушэнняў сярод навучэнцаў Установы;

своечасова інфармаваць законных прадстаўнікоў навучэнцаў аб парушэнні імі Статута і правіл унутранага распарадку Установы;

праходзіць медыцынскі агляд пры паступленні на работу і перыядычныя медыцынскія агляды ў парадку, устаноўленым Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

122. Педагагічную дзейнасць не могуць ажыццяўляць асобы:
пазбаўленыя права займацца педагагічнай дзейнасцю;
якія маюць судзімасць;
якія прызнаны недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі;
якія не маюць права займацца педагагічнай дзейнасцю ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

123. Пры ўзнікненні ў перыяд ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці абставінаў, якія перашкаджаюць яе ажыццяўленню і прадугледжаных пунктам данага Статута, ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці спыняецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

124. Педагагічным работнікам не дазваляецца выкарыстоўваць адукацыйны і выхаваўчы працэсы ў палітычных мэтах або для пабуджэння навучэнцаў да дзеянняў, якія супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і заканадаўству. Іншыя правы і абавязкі, а таксама адказнасць педагагічных работнікаў Установы вызначаюцца актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, Статутам.

125. Законныя прадстаўнікі навучэнцаў Установы маюць права:
выбіраць для навучання дзіцяці установу адукацыі;
удзельнічаць у кіраванні Установай праз органы самакіравання;
азнаеміцца з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;
азнаеміцца з ходам і зместам адукацыйнага працэсу, вынікамі вучэбнай дзейнасці школьнікаў;
атрымліваць інфармацыю аб усіх відах аглядаў (медыцынскіх, псіхалагічных, педагагічных і інш.) дзіцяці, якія праводзяцца ва Установе;
абараняць законныя правы і інтарэсы дзяцей.

126. Законныя прадстаўнікі вучняў абавязаны:
забяспечваць умовы, неабходныя для атрымання адукацыі і ўсебаковага развіцця дзіцяці;
прымаць неабходныя меры для атрымання вучнем агульнай базавай адукацыі;
паважаць гонар дзіцяці і іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;
выконваць патрабаванні правіл унутранага распарадку Установы;
не дапускаецца ўмяшанне законных прадстаўнікоў вучняў у выбар метадаў навучання адпаведных заканадаўству Рэспублікі Беларусь;
выхаванне навучэнцаў Установы забяспечваецца ва ўзаемасувязі іх законных прадстаўнікоў з педагагічнымі работнікамі;
іншыя правы і абавязкі законных прадстаўнікоў навучэнцаў установы вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
законныя прадстаўнікі навучэнцаў Установы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь нясуць адказнасць за неналежнае выхаванне дзіцяці.

## ГЛАВА 12

## ФІНАНСАВАННЕ. КРЫНІЦЫ І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ МАЕМАСЦІ УСТАНОВЫ

127. Фінансаванне Установы ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту, а таксама за кошт дадатковых крыніц фінансавання ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.
128. Ва Установе аказанне дадатковых адукацыйных паслуг ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.
129. Заснавальнік Установы можа даць дазвол Установе ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць толькі ў тых межах, наколькі яна неабходна для рэалізацыі статутных мэтаў, дзеля якіх створана Установа, адпавядае гэтым мэтам і прадмету яе дзейнасці.
130. Аплата працы работнікоў Установы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.
131. Матэрыяльна-тэхнічная база Установы з улікам яе тыпу фарміруецца заснавальнікам у адпаведнасці з нарматывамі, якія ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, уключаючы будынкі і іншую маёмасць, неабходную для арганізацыі навучання і выхавання навучэнцаў, іншай дзейнасці, якая прадугледжана статутам Установы.
132. Установа нясе перад заснавальнікам адказнасць за захаванне і эфектыўнае выкарыстанне замацаванай за імі маёмасці.
133. Установа павінна мець памяшканні для ажыццяўлення адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з тыпавымі вучэбнымі планамі, тлумачальнай запіскай па арганізацыі адукацыйнага працэсу, пазакласнай і пазашкольнай дзейнасці, бібліятэку, а таксама памяшканні для педагагічных работнікаў, гатавання і прыёму ежы, медыцынскі кабінет, бытавыя памяшканні. Памяшканні Установы абсталёўваюцца мэбляй, інвентаром, неабходным вучэбным, медыцынскім абсталяваннем, сродкамі навучання і ўтрымліваюцца, эксплуатуюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі санітарных нормаў, правілаў, гігіенічных нарматываў і правілаў аховы працы.
134. Умацаванне, абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы ажыццяўляюцца за кошт сродкаў заснавальніка і сродкаў, атрыманых з дадатковых крыніц фінансавання:

даходаў ад аказання платных дадатковых адукацыйных паслуг;

даходаў ад прадпрымальніцкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых крыніц, якія не забаронены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 13
## ПАРАДАК РЭАРГАНІЗАЦЫІ І ЛІКВІДАЦЫІ УСТАНОВЫ

135. Рэарганізацыя і ліквідацыя Установы ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

136. Рашэнне аб ліквідацыі Установы прымаецца заснавальнікам на падставе ацэнкі наступстваў такой ліквідацыі з улікам колькасці асоб, належачых навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі на тэрыторыі Установы, і колькасці дзяржаўных устаноў, рэалізуючых адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі на гэтай тэрыторыі.

137. У выніку заканчэння дзейнасці Установы заснавальнік прымае меры па пераводу навучэнцаў з іх згоды, згоды законных прадстаўнікоў непаўналетніх школьнікаў у іншыя ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адпаведныя адукацыйныя праграмы ў парадку, вызначаным Урадам Рэспублікі Беларусь.